ББК 63.3 (2Б)
Г 516

Друкуецца па рашэнні рэдакцыйна-выдавецкага савета БДПУ

*Рэцэнзенты:* загадчык кафедры гісторыі Беларусі Беларускага дзяржаўнага універсітэта, кандыдат гістарычных навук, дацэнт П.І. Брыгадзін; загадчык кафедры гісторыі Беларусі Беларускага лінгвістычнага універсітэта, кандыдат гістарычных навук, дацэнт С.Я. Новікаў.

*Пад агульнай рэдакцыяй* прафесара В. М. Фаміна,
дацэнта У. В. Тугая

Дапаможнік уключае ў сябе артыкулы па найбольш актуальных праблемах гісторыі Беларусі. Яго асаблівасцю з'яўляецца навуковы падыход да асвятлення разглядаемых пытанняў, імкненне выйсці за межы панаваўшых догмаў.

Прызначаецца студэнтам гістарычных факультэтаў вышэйшых педагагічных навучальных устаноў.

ISBN 985-60-87-56-2

© Калектыў аўтараў, 1994.
© *Арыгінал-макет:* А.А. Пакала, 1994.

МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ І НАВУКІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ПЕДАГАГІЧНЫ УНІВЕРСІТЭТ

# ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ

Вучэбны дапаможнік
для студэнтаў гістарычных факультэтаў

Мінск 1994

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*Вучэбнае выданне*

# Гісторыя Беларусі

*Вучэбны дапаможнік*
*для студэнтаў гістарычных факультэтаў*

*Карэктар* А. В. Сідарэнка

Падпісана ў друк 13.12.94. Фармат 60x84 1/16. Папера друк № 2.
Друк афсетны. Ум. друк. арк. 7,5. Ум. фарб.-адб. 8,00. Ул.-выд. арк. 6,7
Тыраж 200 экз. Заказ 1053. Цана 4500 р.

Ратапрынт БДПУ. 220809. г. Мінск, вул. Савецкая, 18.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## ЗМЕСТ

ПРАДМОВА ........ 3

БАЛТЫ І СЛАВЯНЕ НА БЕЛАРУСІ (*С. А. Адамовіч, В. І. Шадыра*) ........ 4

ПРАБЛЕМА ЎТВАРЭННЯ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА. КАНЕЦ XIII — ПЕРШАЯ ПАЛОВА XIV СТ. (*А. Ф. Рацько*) ........ 8

НАПРАМКІ РАЗВІЦЦЯ АДУКАЦЫІ, КУЛЬТУРЫ І НАЦЫЯНАЛЬНАЙ САМАСВЯДОМАСЦІ НА БЕЛАРУСІ Ў XVIII — XIX СТ. (*С. А. Адамовіч*) ........ 16

УДЗЕЛ ТАТАРАЎ-МУСУЛЬМАН У ПАЎСТАННІ 1794 ГОДА ПАД КІРАЎНІЦТВАМ ТАДЭВУША КАСЦЮШКІ (*І. Б. Канапацкі*) ........ 23

ХТО ПЕРАМОГ НА Р. БЯРЭЗІНЕ Ў ЛІСТАПАДЗЕ 1812 ГОДА? (*І. А. Груна*) ........ 29

НЕКАТОРЫЯ ПЫТАННІ ДВАРАНСКАГА ЗЕМЛЕЎЛАДАННЯ НА БЕЛАРУСІ (ДРУГАЯ ПАЛОВА XIX — ПАЧАТАК XX СТАГОДДЗЯ) (*А. П. Жытко*) ........ 38

АГУЛЬНААДУКАЦЫЙНАЯ І ПРАФЕСІЙНАЯ ПАДРЫХТОЎКА РАБОЧЫХ І СЛУЖАЧЫХ ДЛЯ ЧЫГУНАК БЕЛАРУСІ Ў 1900-1913 ГГ. (*П. А. Тупік*) ........ 44

БЕЛАРУСЬ У ГАДЫ ПЕРШАЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ (*М. В. Цуба*) ........ 53

АСВЯТЛЕННЕ АБАРОНЫ БЕЛАРУСКІХ ТЭРЫТОРЫЙ АД ПОЛЬСКІХ ВОЙСК У 1919 Г. У ДРУКУ БЕЛАРУСІ І ЗАХОДНЯГА ФРОНТУ (*У. У. Куніцкі*) ........ 62

ДА ПЫТАННЯ АБ УТВАРЭННІ І ДЗЕЙНАСЦІ МІНСКАГА КАМІТЭТА АБ'ЯДНАНАЙ АРГАНІЗАЦЫІ РСДРП (САКАВІК — ЛІПЕНЬ 1917 Г.) (*М. Я. Сяменчык*) ........ 67

ПАЛІТЫЧНЫЯ РЭПРЭСІІ НА БЕЛАРУСІ Ў КАНЦЫ 20-Х — 30-Я ГАДЫ (*М. К. Сакалоў*) ........ 78

БЕЛАРУСІЗАЦЫЯ Ў ГАЛІНЕ НАРКАМАСВЕТЫ Ў 20-Я ГАДЫ (*У. В. Тугай, В. Ц. Ісаеў*) ........ 87

ПОЛЬСКІЯ НАЦЫЯНАЛЬНЫЯ САВЕТЫ НА БЕЛАРУСІ (20-30-Я ГГ. XX СТ.) (*У. В. Тугай, В. М. Фамін*) ........ 92

ФАРМІРАВАННЕ І ДЗЕЙНАСЦЬ ПАДРАЗДЗЯЛЕННЯЎ АРМІІ КРАЁВАЙ АКРУГІ "НАВАГРУДАК" (*С. П. Варадзін*) ........ 96

ПРАФСАЮЗЫ БЕЛАРУСІ Ў СІСТЭМЕ САВЕЦКАГА ТАТАЛІТАРЫЗМУ Ў ПАСЛЯВАЕННЫЯ ГАДЫ (1945-1985) (*Ф. А. Шумскі*) ........ 107

наркамаў і іх намеснікаў — 40 чалавек, кіруючых работнікаў савецкага, гаспадарчага апарату — 179, акадэмікаў і навукоўцаў — 25, выкладчыкаў ВНУ — 41, супрацоўнікаў ЦК КП/б/Б — 23, Саўнаркама — 16 чалавек і г.д. Кіраўнікамі "трацкісцкай арганізацыі" на Беларусі былі названы М. Гікала, М. Галадзед, Д. Валковіч, В. Шаранговіч і інш. кіраўнікі рэспублікі.

Сярод абвінавачванняў, прад`яўленых арыштаваным, было стварэнне антысавецкай арганізацыі на Беларусі, якая па заданню цэнтра правых у Маскве, сумесна з трацкістамі, рыхтавала здзяйсненне тэрарыстычных актаў над тт. Сталіным, Варашылавым і Калініным.

Следчымі органамі арыштаваныя былі падзелены па наступных "арганізацыях": нацыянал-фашысцкае падполле — ягонымі кіраўнікамі былі вызначаны Чарвякоў, Шаранговіч, Жылуновіч і інш.; антысавецкае эсэраўскае падполле — у яго ЦК уваходзілі Чарнушэвіч, Бадунова, Панкевіч; антысавецкае бундаўска-сіяністкае падполле — Волт, Гурэвіч; царкоўна-сектанскае падполле — кіраўнік "японa-польскі шпіён" мітрапаліт Бліноў.

Рэпрэсіі ў гэтыя гады прымалі ўсё больш маштабны характар, станавіліся масавымі, закраналі ўсе без выключэння слаі насельніцтва. Згодна дадзеных саміх карных органаў, якія змешчаны ў дакуменце пад назвай: "Статыстычныя звесткі рэпрэсіраваных шпіёнаў, дыверсантаў і паўстанцаў польскай, латвійскай і нямецкай разведак за час з 1 чэрвеня па 1 верасня 1938 г."[1], г.зн. толькі за тры месяцы было рэпрэсіравана больш за 6,5 тыс. чалавек, у тым ліку кулакоў — 1844, калгаснікаў — 1762, служачых — 1268, аднаасобнікаў — 640, рабочых — 424, саматужнікаў — 227 чалавек і г.д. Прыкметна, што з катэгорыі т.зв. "кулакоў" да арышту працавалі ў калгасах — 1032, на прамысловых прадпрыемствах — 136, у савецкіх установах — 161, былі аднаасобнікамі — 352, хатнімі гаспадынямі — 13 чалавек.

Менавіта тады з`явіліся на Беларусі такія месцы масавых забойстваў ахвяр сталінскага рэжыму, як Курапаты, Магілёўскія кар`еры, і яны былі не адзінымі.

Новы ўздых хвалі рэпрэсій назіраецца з восені 1939 года, пасля ўваходжання Заходняй Беларусі ў склад БССР. У гэтых абласцях былі рэпрэсіраваны, у асноўным у выглядзе высылкі ва ўсходнія раёны СССР, цэлыя групы насельніцтва — служачыя былога дзяржапарату, судовых органаў, пракуратуры, паліцыі, арміі, гандляры, леснікі, рамеснікі і інш.

Пытанні аб тым, колькі жыхароў Беларусі пацярпела ад палітычных рэпрэсій сталінскага рэжыму, не высветлена і да сёння. Наконт гэтага ёсць розныя, але не зусім абгрунтаваныя лічбы[2]. Афіцыйнымі

---

[1] Правда истории: память и боль. Минск. 1991. С. 87-88.

[2] *Адамушка У.* Лічбы на сэрцы. Колькі чалавечых лёсаў пакалечыў таталітарны рэжым // Беларуская думка. 1992. № 7.



дзяржаўнымі органамі Беларусі па стану на 1991 г. перагледжаны звыш 70 тыс. спраў на рэпрэсіраваных і на гэтай падставе рэабілітаваны амаль 120 тыс. чалавек. Яшчэ неабходна было перагледзіць прыблізна 75,5 тысяч спраў у адносінах да 121 тыс. чалавек. Такім чынам, судовымі і пазасудовымі органамі толькі па палітычных матывах (заўважым, што акрамя таго былі рэпрэсіі ў адміністрацыйным парадку, рэпрэсіі супраць сялянства ў ходзе калектывізацыі, рэпрэсіі ў ходзе выканання закону "Аб ахове сацыялістычнай маёмасці", рэпрэсіі ў войску і г.д.) былі прыцягнуты да адказнасці больш як за 240 тыс. чалавек, жыццё і лёс якіх былі бязлітасна парастоптваны, парушаны сталінскім рэжымам. Агульная ж колькасць сталінскіх ахвяр 30-х гадоў на Беларусі па ўскосных даных перавышае 2 млн. чалавек.

## БЕЛАРУСІЗАЦЫЯ Ў ГАЛІНЕ НАРКАМАСВЕТЫ Ў 20-Я ГАДЫ

У.В. Тугай

Вялікая роля ў ліквідацыі непісьменнасці і арганізацыі сістэмы народнай адукацыі ў пачатку 20-х гадоў у рэспубліцы належала Наркаму асветы. Пачаткам заснавання планавай, сістэматычнай працы па стварэнню зладжанай сістэмы народнай асветы з`явіўся 1922/23 вучэбны год. У гэтым годзе былі вызначаны тыпы навучальных устаноў і штаты для іх, а таксама распрацаваны новыя вучэбныя праграмы. Урадам рэспублікі былі выдзелены значныя сродкі для стварэння вучэбна-матэрыяльнай базы, якая з кожным наступным годам ўсё больш умацоўвалася. У 1926/27 вучэбным годзе для народнай асветы было накіравана каля 20 млн. руб., што на 170,4% больш, чым у 1923/24 вучэбным годзе[1]. Першае месца ў сістэме народнай асветы па затрачаных сродках займалі працоўныя школы, у якіх у 1926/27 вучэбным годзе займалася 397741 навучэнец.[2] З улікам нацыянальнай палітыкі з 1924/25 вучэбнага года ва ўсіх школах уводзілася беларуская мова як абавязковы прадмет, незалежна ад таго, на якой мове вялося навучанне ў той ці іншай школе. Трэба зазначыць, што бацькі вучняў і самі вучні добразычліва аднесліся да гэтага новаўвядзення. У школах адкрываліся гурткі па вывучэнню беларускай мовы. Некалькі цяжэй гэты працэс адбываўся ў рускіх школах і школах нацыянальных меншасцей. Гэтыя абставіны тлумачыліся ў першую чаргу нежаданнем некаторых педагогаў у сталым узросце перавучвацца, ды і вывучэнне новай мовы для іх было звязана з пэўнымі цяжкасцямі.

Працэсу беларусізацыі садзейнічала выданне падручнікаў на беларускай мове і ў першую чаргу буквароў, а таксама арганізацыя летніх

---

[1] Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 701, оп. 1, с. 40, л. 68.

[2] Там жа.



РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

кароткатэрміновых курсаў па вывучэнню беларускай мовы. Пры камплектаванні вучнямі школ у мясцовасцях з розным нацыянальным складам, кіруючыся дырэктывай Урада, у першую чаргу ўлічвалася гутарковая мова дзяцей. Вучняў, якія размаўлялі на беларускай мове, прызначалі ў беларускія школы, на яўрэйскай — у яўрэйскія і гэтак далей. Наогул, пераход школ на беларускую мову праходзіў без асаблівых складанасцей, хаця мелі месца некаторыя выпадкі пратэстаў. Так, у Аршанскай акрузе бацькі патрабавалі, каб іх дзеці вучыліся на рускай мове. Афіцыйна лічылася, што там маглі мець месца або злосная агітацыя з чыйго-небудзь боку, або памылка з боку аддзела адукацыі аб пераводзе школ на беларускую мову ў мясцовасці, насельніцтва якой не з'яўляецца беларусамі[1]. Для дзяцей беларусаў-католікаў уводзіліся змешаныя школы: польска-беларускія ці беларуска-польскія з улікам перавагі тэндэнцый ў мясцовага насельніцтва.

Трэба адзначыць, што да ўзбуйнення Беларусі ўсе сельскія пачатковыя школы былі пераведзены на беларускую мову. Перавод у 1925 г. на беларускую мову пятых класаў выклікаў пэўныя цяжкасці: не хапала беларускіх падручнікаў, кваліфікаваных педагогаў, здольных весці заняткі ў старэйшых класах на беларускай мове. У сувязі з гэтым у 1925 г. значна пашырылася сетка вышэйшых курсаў беларусазнаўства. Горшыя справы былі з выданнем падручнікаў на беларускай мове. Да 1925 г. Дзяржаўным выдавецтвам быў выдадзены ў дастатковай колькасці толькі буквар (100000 экз.), а іншыя падручнікі не здавальнялі і 10% попыту[2].

1925/26 — 1926/27 вучэбныя гады — гэта гады бурнага развіцця народнай адукацыі ў Беларусі. У пачатковых і сямігадовых школах колькасць камплектаў павялічылася на 1084[3]. Стан развіцця народнай адукацыі ў рэспубліцы выклікаў неабходнасць увядзення ўсеагульнага абавязковага пачатковага навучання. Пастановай СНК і ЦВК БССР ад 7 красавіка 1926 г. былі вызначаны асноўныя прынцыпы і прызначаны канчатковы 1934/35 вучэбны год яго ўвядзення. Асноўным тыпам працоўнай школы для правядзення ўсеагульнага навучання лічылася 4-гадовая двухкамплектная школа з колькасцю ў 40 чалавек і радыусам абслугоўвання не больш за 3 км[4].

У аснову пабудовы сістэмы народнай адукацыі пасля кастрычніцкага перавароту быў пакладзены нацыянальны прынцып, які даваў магчымасць усяму насельніцтву рэспублікі атрымліваць адукацыю на роднай мове. У 1926/27 вучэбным годзе беларускія пачатковыя школы складалі ў сістэме адукацыі 85,3%, рускія — 8,4%, яўрэйскія — 3,2%, польскія — 2,6% і

[1] Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 701, оп. 1, с. 4, л. 20.
[2] Там жа, л. 26.
[3] Там жа, с. 40, л. 231.
[4] Там жа, л. 233.



іншыя — 0,5%[1]. Такім чынам, працэнт школ, ажыццяўляўшых навучанне на нацыянальных мовах, па сутнасці адпавядаў колькасці насельніцтва адпаведных нацыянальнасцей, якія жылі на тэрыторыі Беларусі. З кожным годам працэс беларусізацыі набіраў сілу. Калі ў 1924/25 вучэбным годзе вучэбны працэс поўнасцю ажыццяўляўся на беларускай мове ў 28,4% усіх пачатковых школ рэспублікі і 1,6% сямігадовых, то ўжо ў 1925/26 — адпаведна 79,6% і 43,7%[2].

Працэс беларусізацыі ахапіў таксама вячэрнія школы дарослых, школы рабочай і сельскай моладзі. У апошніх у 1923/24 вучэбным годзе навучалася звыш 5 тысяч чалавек. Пры гэтым з кожным годам павялічвалася колькасць сялянак, жадаючых атрымаць адукацыю. У школах, дзе заняткі былі прыстасаваны да бытавых умоў апошніх, колькасць сялянак дасягала 60%[3].

Пачынаючы з 1922/23 вучэбнага года, ствараюцца вячэрнія школы рабочай моладзі і школы павышанага тыпу. К 1927 году Беларусь ужо мела ў гарадах і мястэчках 126 школ гэтага тыпу, у якіх навучалася звыш 12 тыс. чалавек[4]. У будучым школы павышанага тыпу з 4-гадовым тэрмінам навучання павінны былі падрыхтоўваць слухачоў у вышэйшыя навучальныя ўстановы, а рабочую моладзь — у тэхнікумы.

У вывучаемыя гады Наркам адукацыі рэспублікі звяртаў значную ўвагу на беларусізацыю вучэбнага працэсу ў сярэдніх спецыяльных і вышэйшых навучальных установах. Беларуская мова як вучэбны прадмет была ўведзена ва ўсіх установах. На ёй выкладаліся гісторыя і геаграфія Беларусі. Працэс беларусізацыі ў вышэйшых і сярэдніх навучальных установах праходзіў у дзелавых абставінах, не наглядалася выпадкаў супраціўлення ні з боку педагагічных кадраў, ні з боку студэнтаў. Наадварот, адзначаўся вялікі інтарэс да вывучэння "беларусазнаўства", пацверджаннем чаму можна лічыць адкрыццё розных кароткатэрміновых курсаў, гурткоў па вывучэнню беларускай мовы. Значная частка педагогаў і студэнтаў вывучала родную мову самастойна. З вялікай зацікаўленасцю ставіліся да гэтага і студэнты педфака БДУ, педагагічных тэхнікумаў, дзе беларусы складалі большую частку навучэнцаў. Яны яскрава ўсведамлялі сваю ролю ў адраджэнні роднай мовы і беларускай культуры.

Значна цяжэй адбывалася ўвядзенне беларускай мовы на рабфаках. Справа ў тым, што да 1926/27 вучэбнага года рабфакі рэспублікі мелі тэхнічны ўхіл і слухачы іх, як правіла, рыхтаваліся для паступлення ў тэхнічныя ВНУ іншых рэспублік, таму што такіх у Беларусі не было. Пачынаючы з 1927/28 вучэбнага года рабфакі, нарэшце, былі

[1] Там жа, л 237.
[2] Там жа, с. 40, л. 238.
[3] Там жа, л. 243.
[4] Там жа, л. 244.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

перапрафіляваны, і беларускія ВНУ пачалі камплектавацца мясцовымі рабфакаўцамі. Адначасова з гэтым на рабфаках была павялічана колькасць вучэбных гадзін на беларускую мову.

Значныя цяжкасці ў беларусізацыі выпрабоўвалі педагагічныя тэхнікумы. У першую чаргу гэта тлумачылася адсутнасцю кваліфікаваных беларусаведаў. К 1927 г. поўнасцю забяспечваўся вучэбны працэс на беларускай мове толькі ў Мінскім педагагічным тэхнікуме і часткова ў Рагачоўскім. Астатнія чатыры педтэхнікумы працягвалі навучанне на рускай мове. У сувязі з гэтым Наркам адукацыі значныя надзеі ў забеспячэнні беларусаведамі педтэхнікумаў ускладаў на педфак БДУ, першы выпуск якога адбыўся ў 1925 годзе.

На жаль, яшчэ горш адбываўся працэс беларусізацыі ў індустрыяльных і асабліва сельскагаспадарчых тэхнікумах. Асноўнай прычынай была не толькі адсутнасць педагогаў па спецыяльнасці, валодаўшых беларускай мовай, але і тое, што апошнія не падпарадкоўваліся Наркаму адукацыі. Хаця, трэба зазначыць, што кантынгент навучэнцаў у асноўным складаўся з беларусаў. У 1927 г. ступень беларусізацыі ў сельска-гаспадарчых тэхнікумах налічвала толькі 36,%[1].

Працэс беларусізацыі як аснова нацыянальнай палітыкі, такім чынам, на сваім шляху сустракаў значныя цяжкасці, якія ў першую чаргу тлумачыліся адсутнасцю ў дастатковай колькасці беларусаведаў і педагогаў спецыяльных дысцыплін, валодаўшых беларускай мовай. Мелі месца падчас і негатыўныя моманты, калі за няведанне беларускай мовы вызваляліся з пасады высокакваліфікаваныя спецыялісты, уступаючы месца кар'ерыстам, здаўшым залік па беларускай мове. Наркам адукацыі разумеў усю складанасць у забеспячэнні вучэбных устаноў спецыялістамі, валодаўшымі беларускай мовай,прыцягваў педагагічных і навуковых супрацоўнікаў з-за мяжы рэспублікі, ствараючы для іх неабходныя ўмовы.

Вялікія надзеі Наркам адукацыі ў рашэнні педагагічных кадраў ускладаў на ВНУ рэспублікі і ў першую чаргу на БДУ. На жаль, у той час флагман падрыхтоўкі нацыянальных педагагічных і іншых кадраў не меў у дастатковай колькасці высокакваліфікаваных спецыялістаў, валодаўшых беларускай мовай. Гэта сведчыла аб тым, што фарміраванню педкадраў ВНУ рэспублікі ніхто не ўдзяляў увагі. У 1925/26 вучэбным годзе склад педагагічных кадраў вышэйшых навучальных устаноў як па нацыянальнасці, так і па валоданню беларускай мовай не даваў магчымасці паспяхова праводзіць беларусізацыю. Так, напрыклад, з 58 выкладчыкаў і прафесараў БДУ было толькі 12 беларусаў, з якіх 8 валодалі беларускай мовай, а з 38 прафесараў — толькі адзін, з 58 асістэнтаў — 8[2].

---

[1] Там жа, л. 257.

[2] Там жа, с. 4, л. 12-13.



У наступныя гады пры ўладкаванні педагогаў ў навучальныя ўстановы рэспублікі пачалі ўлічваць нацыянальнасць і веданне беларускай мовы. Адначасова з гэтым у навучальных установах у абавязковым парадку ўводзіўся цыкл прадметаў па беларусазнаўству: беларуская мова, гістарычная і навуковая граматыка сучаснай беларускай мовы, беларуская літаратура і народная славеснасць, беларуская мастацкая літаратура, гісторыя беларускай культуры, гісторыя і геаграфія Беларусі. Усе гэтыя прадметы выкладаліся на беларускай мове.

Далейшы лёс беларусізацыі шмат залежаў ад нацыянальнага складу студэнтаў, якія павінны былі вытрымліваць пры паступленні ў вучэбныя ўстановы вялізны конкурс. На жаль, і тады пры паступленні ў ВНУ мелі месца пратэкцыі, сувязі, рэкамендацыі і г. д. Яшчэ ў пачатку 20-х гадоў, напрыклад, камісія па правядзенню беларусізацыі зазначыла, што конкурс пры паступленні ў ВНУ вытрымліваў падчас той, хто меў больш сувязей, хто ведаў усе "уваходы і выхады". Беларус, у большасці выпадкаў нясмелы селянін, і яго выцясняли больш актыўныя: яўрэй ці вялікарос. Пры залічэнні ў ВНУ нярэдка перавагу аддавалі рэкамендаваным прафсаюзамі, а што датычыць рабфакаў, то туды прымалі сялян як выключэнне[1]. У 1923/24 вучэбным годзе сярод студэнтаў педфака БДУ беларусы складалі: 48%, яўрэі — 40%, рускія — 6% і 6% — прадстаўнікі іншых нацыянальнасцей; медфака: беларусы — 32%, яўрэі — 58%, рускія — 7% і 3% — прадстаўнікі іншых нацыянальнасцей[2]. Такім чынам, працэнт беларусаў сярод студэнтаў БДУ быў невялікі. Пачынаючы з 1924/25 вучэбнага года, пры паступленні ў ВНУ трэба было абавязкова ведаць беларускую мову, за выключэннем абітурыентаў з далучаных да Беларусі раёнаў, дзе раней беларуская мова не вывучалася.

Галоўную ролю ў беларусізацыі вучэбных устаноў адыгрывала беспартыйная беларуская інтэлігенцыя. На жаль, сур'ёзнай перашкодай у правядзенні беларусізацыі з'яўлялася бяздзейнасць значнай часткі камуністаў, кіраўнікоў сярэдняга і нізавых звенняў партапарату. Як адзначала камісія па беларусізацыі: "Толькі самая нязначная частка камуністаў актыўна ўключылася ў правядзенне нацыянальнай палітыкі, а астатняя маса партыйцаў у большасці выпадкаў пасіўна назірае за гэтым працэсам"[3]. Тым не менш беларусізацыя з кожным годам усё больш і больш пашыралася. У 1925/26 вучэбным годзе на беларускую мову выкладання былі пераведзены першыя курсы рабфакаў, а ў наступным годзе беларусізацыя ў іх склала 68,8%. Прыкметныя зрухі былі бачны і ў ВНУ. У 1927 годзе ў БДУ беларусізацыя склала 31%[4]: за 1922-1927 гг. БДУ

---

[1] Там жа.

[2] Там жа.

[3] Там жа, л. 49.

[4] Там жа, л. 260.

скончылі 273 педагогі, 170 урачоў, 125 эканамістаў[1]. Гэтыя спецыялісты ў далейшым прымалі актыўны ўдзел у беларусізацыі навучальных устаноў. К 1927 г. значна змяніўся склад студэнцтва: беларусаў было 60,3%, яўрэяў — 28%, рускіх — 4,8%, палякаў — 1,2% і 5,7% — студэнтаў іншых нацыянальнасцей[2].

Такім чынам, у выніку актыўнай дзейнасці Наркама, інтэлігенцыі к канцу 20-х гадоў былі дасягнуты значныя поспехі ў беларусізацыі сістэмы народнай адукацыі. Гэта сведчыла аб тым, што нягледзячы на аб`ектыўныя цяжкасці — бедная вучэбна-матэрыяльная база, адсутнасць дастатковай колькасці высокакваліфікаваных нацыянальных педагагічных кадраў — і суб`ектыўныя перашкоды працэс беларусізацыі быў горача падтрыманы беларусамі і даў плённыя вынікі.

## ПОЛЬСКІЯ НАЦЫЯНАЛЬНЫЯ САВЕТЫ НА БЕЛАРУСІ (20-30-Я ГГ. XX СТ.)

У.В. Тугай, В.М. Фамін

У гісторыі сусветнай польскай дыяспары польская нацыянальная меншасць у СССР займае асобнае месца. Яго генеалагічная лінія была найбольш даўняй у Еўропе. Духоўныя стэрэатыпы палякаў на далёкіх крэсах фарміраваліся пад уздзеяннем традыцый барацьбы за захаванне сваёй польскасці, якія існавалі шмат стагоддзяў. Пасля кастрычніцкіх падзей 1917 года, а таксама падзей 1918 і 1919 гадоў на Беларусі большая частка з іх аднеслася да гэтага абыякава, з недаверам. Яна больш праяўляла сімпатыі і лаяльнасці ў адносінах да сваёй адроджанай радзімы — Польшчы. Гэтая група насельніцтва прадстаўляла сабой у асноўным этнічна карэнны аўтахтанічны элемент, хоць і не састаяла з выключна генетычна польскіх нацыянальных элементаў. Значная яе частка складалася з генетычна беларускіх нацыянальных груп, якія ў розныя перыяды перайшлі ў каталіцтва і паланізаваліся. Тут даўно панаваў стэрэатып вызначэння нацыянальнай прыналежнасці "каталік — паляк". У гэтым сэнсе рэлігійны крытэрый пануваў над усім іншым: моўным, культурным, грамадскім ці эканамічным.

У канцы XIX — пач. XX ст. колькасць польскага насельніцтва Беларусі і Літвы складала 5,5 — 5,6%. У асноўным палякі пражывалі у Трокскім, Віленскім і Свенцянскім паветах Віленскай губ., Бельскім, Беластоцкім і Гродзенскім паветах Гродзенскай губ., Ковенскім, Вількамірскім, Новаалександраўскім, Паневежскім і Шавельскім паветах Ковенскай губ. і ў Мінскім павеце. Трэба адзначыць адносна вялікую колькасць польскага насельніцтва ў многіх буйных гарадах краю: у Вільні — 47,8 тыс. (30,9%), Коўне — 16,0 тыс. (22,5%), Беластоку — 11,3 тыс.

[1] Там жа, л. 262.

[2] Там жа, л. 266



(16,9%), Гродне — 6,8 тыс. (14,0%). У гарадах шасці заходніх губерняў польскае насельніцтва складала 12,7%, у сельскай мясцовасці — толькі 4,6%.[1]

Палітыку савецкай дзяржавы ў адносінах да польскай нацыянальнай меншасці можна ўмоўна падзяліць на два перыяды, якія дыяметральна адрозніваюцца адзін ад другога. Першы перыяд адзначаецца стварэннем" шырокай сеткі польскай нацыянальнай аўтаноміі. III сесія ЦВК БССР, якая адбылася ў жніўні 1923 г., пацвердзіла поўнае раўнапраўе моў — беларускай, рускай, яўрэйскай, польскай, дэкларыравала права насельніцтва звяртацца ва ўсе дзяржаўныя ўстановы на сваёй роднай мове і абавязацельства ўсіх дзяржаўных устаноў адказваць на той жа мове.[2]

Спасылаючыся на недахопы сродкаў, сесія звярнулася да беларускага, яўрэйскага, польскага насельніцтва з заклікам дапамогі савецкай уладзе ў будаўніцтве культурна-асветніцкіх устаноў на роднай мове.

Польскія сельскія саветы пачалі ствараць у другой палове 1924 г. К пачатку 1925 г. на Беларусі налічвалася 2 польскія саветы. У сярэднім па дзяржаве (СССР) на польскі сельскі савет прыпадала 1166 чалавек (яўрэйскі — 2132). Па Украіне гэтая лічба склала 1000 чалавек, пазней — 500 чалавек. На Беларусі ў такой жа пастанове за норму для арганізацыі нацыянальнага польскага савета колькасць жыхароў склала 1200 чалавек. Аднак на практыцы гэта не было рэалізавана. У 1929 г. сярод 51 небеларускага сельскага савета 22 з`яўляліся польскімі, 14 — рускімі, 4 — яўрэйскімі, 4 — латышскімі, 3 — украінскімі, 2 — нямецкімі, 1 — літоўскім. Гэтыя польскія саветы ўключалі толькі 19% палякаў, якія афіцыйна былі зарэгістраваны, і 23,7% польскіх жыхароў вёскі.[3] З 1925 г. да 1933 г. колькасць польскіх сельскіх саветаў павялічылася з 2 да 40, аднак у наступным годзе яна паменшылася да 34.[4]

У пачатку 30-х гадоў у СССР былі" створаны дзве мініяцюрныя польскія "сацыялістычныя рэспублікі!". Адна на Украіне, т. з. Мархлеўшчына (раён Жытоміра) і на Беларусі імя Ф.Дзяржынскага (недалёка ад Мінска). Цэнтрам польскага нацыянальнага раёна на Беларусі з`яўлялася" мястэчка Койданава. У койданаўскім прыгранічным раёне пражывала 50% палякаў. Калі далучыць да яго суседнія раёны, дзе жылі палякі (Уздзенскі, Заслаўскі, Мінскі), то гэтая лічба складала 60%.[5]

[1] Усебеларуская канферэнцыя гісторыкаў. Гістарычная навука і гістарычная адукацыя ў Рэспубліцы Беларусь (новыя канцэпцыі і падыходы). Мінск, 3-5 лютага 1993 г. Тэзісы дакладаў і паведамленняў. Частка 1. Гісторыя Беларусі. М., 1993. С. 130.

[2] Там жа, с. 176.

[3] Mikolaj Iwanow. Pierszy narod ukarany polacy w zwiazku radzieckim 1921-1939/ Warzawa-Wroclaw? 1991. Panstwowe wydawnictwo naukowe. С. 141.

[4] Там жа.

[5] Там жа, с. 129.